# Пачалі адстрэльваць рэдкія віду птушак

Паводле інфармацыі мясцовых жыхароў,з пятніцы на суботу першага тыдяя жніўня на рыбгасе “Волма” Мінскай вобласці стаяла сапраўдная кананада. Дазволілі паляванне не на ўсіх водасховішчах рыбгаса, але якраз на той сажалцы, дзе пасялілася адзіная ў гэтай мясцовасці сям'я шэрай гусі. Тут у красавіку яны адклалі яйкі, а ў пачатку і мая на свет з'явіліся I птушаняты. Папяўнічы застрэліў менавіта, трох маладых птушак. Потым над сажалкамі яшчэ доўга на вышыні кружыліся дзве дарослыя птушкі. Час ад часу да болі у грудзях слых раздзіраў хрыплы птушыны крык бязмежнага бацькоўскага гора...



Данным з аргуметаў, што вылучаюцца паляўнічымі на карысць веснавога палявання на птушак у Беларусі, з'яўляецца тое, што ў той час большасць гусей мігрыруе праз машу краіну і калі іх не здабыць тут, то птушак адстраляюць потым недзе ў паўночных рэгіёнах Расіі. З летне-асеннім паляваннем сггуацыя ўжо зусім іншая. Пералёт “чужых” гусей пачнецца значна пазней. Такім чынам, усе гусі, што трапляюць на мушку летам, з'яўпяюцца нашымі мясцовымі беларускімі пттушкамі. Часцей за ўсё пад стрэл трапляюць менаеіта маладыя, нявопытныя птушкі. У жніўні ў вялікай колькасці птушак, якія дазволены да паляваннй, птушаняты яшчэ не падняліся на крыло і моцна залежаць ад бацькоў. Калі падстрэльваюць самку, то яшчэ неразумнан крылатая моладзь лёгка робіцца здабычай драпежнікаў, расказвае спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" Руслан Шайкін. Паляванне працятецца да сярэдзіны снежнн. няўжо яго абавязкова трэба пачынаць ужо ў жніўні? Даведка АПБ:

Шэрая гусь — Птушка 2009 года ў Беларусі. Яна з'яўлнецца адзіным з чатырох відаў гусей, што гняздуюцца на тэрыторыі нашай краіны. Спецыялісты падлічылі, што колькасць беларускай папуляцыі шэрых гусей складае ўсяго каля 200 пар. Для параўнання: папуляцыя рэдкага чорнага бусла, які занесен у чырвоную кнігу Беларусі, налічвае 950—1300 пар. Паляўнічыя, не страляйце па шэрых гусях.

***С.Куркач***

**Источник:** Звязда.-2009.-15 жн.-С.7.